Легенды і паданні Слонімшчыны

Сабраў і пераказаў
СЯРГЕЙ ЧЫГРЫН

Мінск
«Кнігазбор»
2013

УДК 821.161.3-3
ББК 84(4Беи)
Л33

Легенды і паданні Слонімшчыны
Л33 / склад. С. Чыгрын. — Мінск : Кнігазбор, 2013. — 124 с.
ISBN 978-985-7057-66-5.

У гэту мініяцюрную кніжачку ўвайшлі легенды і паданні Слонімшчыны, якія сабраў і пераказаў літаратар, гісторык і краязнавец Сяргей Чыгрын са Слоніма.

УДК 821.161.3-3
ББК 84(4Беи)

ISBN 978-985-7057-66-5

Збіральніцкая справа духоўных народных скарбаў працягваецца

Задача збірання і апублікавання вуснай народнай творчасці сёння асабліва надзённая. У выніку сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў адбываецца разбурэнне традыцыйнай беларускай вёскі. Многія населеныя пункты перасталі існаваць ці знаходзяцца на мяжы існавання. Гэта і іншыя прычыны прыводзяць да страты рэгіянальнай вуснай народнай творчасці, якая стваралася цягам стагоддзяў. Калі яе не занатаваць сёння, то пазней зрабіць гэта будзе, хутчэй за ўсё, немагчыма.

Чарговая кніга вядомага пісьменніка, публіцыста і краязнаўца Сяргея Чыгрына ўключае творы вуснага на-

роднага мастацтва, рупліва сабраныя на працягу многіх гадоў ад сваіх землякоў. Улюбёны ў родную Слонімшчыну, Сяргей Чыгрын не мог абысці ўвагай такі прыкметны фрагмент народнай культуры, як легенды і паданні.

Амаль усе яны выконваюць растлумачальна-пазнавальную функцыю, апавядаюць пра штосьці даўняе, вартае памяці людзей. Праз легенды і паданні жыхары Слонімшчыны здаўна імкнуліся растлумачыць паходжанне мясцовых аб'ектаў і назвы вёсак, рэчак, азёраў, крыніц, асобных дрэў, камянёў, лясных мясцінаў, урочышчаў і інш.

У аснове вытлумачэння ляжаць рэальныя факты мінулага, якія ў гістарычным часе абраслі домысламі, легендарна значныя падзеі, уяўнафантастычныя сюжэты, імёны канкрэтных людзей і наднатуральных істо-

таў. Напрыклад, Слонімшчына яшчэ не страціла памяць пра набегі крыжакоў. Жыхары вёскі Азярніца паходжанне назвы рэчкі Акоўка тлумачаць наступным чынам. Крыжакі заўважылі вяскоўцаў на невялічкім астраўку і рашылі захапіць, каб знішчыць. Рушылі ўброд праз рэчку. Людзі сталі прасіць у Бога паратунку. І раптам сярод лета наступіла зіма, і крыжакоў у рэчцы скавала лёдам. Адсюль і назва пайшла — Акоўка.

Шэраг назваў звязаны з рэальнымі асабовымі імёнамі мясцовых сялян (Тарасаў груд, Шпакава гара), паноў (Сурынка — пан Сурын, Скуратава студня — багацей Скурат).

Тыповымі на слонімскай зямлі, як і ва ўсёй Беларусі, выступаюць легенды і прымхліцы пра закапаны скарб (Гарадзішча каля Збочна), пра вёску

ці царкву, якія праваліліся ў бездань (возера Бяздоннае, П'явіч-возера, Святое возера).

Народнай фантазіяй аздоблены кароткія аповеды, у якіх дзейнічаюць істоты язычніцкай славянскай міфалогіі, такія, як чорт (Чортава Вока, Чортава балота, Чортаў камень), змей (вёска Лапухова), русалка (вёска Азярніца), лесавік (урочышча Вомшар) і іншыя.

Многія ўласныя назвы жыхары Слонімшчыны тлумачаць з пункту гледжання народнай этымалогіі, якая адштурхоўваецца не ад фактаў, а ад самога наймення, яго «гаварковасці». Зразумела, такія этымалогіі не з'яўляюцца навуковымі, але яны цікавыя тым, што раскрываюць моватворчае чуццё і фантазію нашых продкаў: вёска Смаўжы (у балоце было многа смаўжоў), рэчка Іярданка (сын Іяр і дачка

Данка), вёска Клепачы (жыхары вельмі рана пачыналі кляпаць косы ў час касавіцы), Трыбушкі (жыхары вельмі любілі шмат есці, набіваць трыбухі), вёска Яруцічы (ад яма Руціча).

Кніга Сяргея Чыгрына «Легенды і паданні Слонімшчыны» карысная, цікавая і для навукі, і для ўсіх, каму дарагая родная мова і культура. Яна добры знак таго, што збіральніцкая справа духоўных народных скарбаў працягваецца, не заглухла. Гэта свайго роду прыклад і ўзор для краязнаўцаў іншых рэгіёнаў, пачэсны абавязак якіх — зрабіць падобнае ў сваёй мясцовасці.

Мікола ДАНІЛОВІЧ,
доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык кафедры беларускага
і тэарэтычнага мовазнаўства
Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта
імя Янкі Купалы

Азярніца

Пра вёску Азярніца існуе некалькі легендаў. Адна з іх распавядае пра тое, што вёска некалі знаходзілася сярод невялікіх азёр. Таму і стала называцца Азярніца.

Згодна з іншай легендай, Азярніца называецца гэтак, таму што некалі ў гэтым краі ў азёрах было шмат русалак, якіх людзі клікалі азярніцамі. Вельмі часта русалкі-азярніцы выходзілі на бераг і гайдаліся на галінках бярозаў і вербаў. А тых, хто да іх трапляў, азярніцы маглі да смерці заказытаць.

Асабліва русалкі любілі лавіць хлопцаў. Але колькі юнакоў заказыталі азярніцы — ніхто не ведае.

А яшчэ бытуе легенда, што назва Азярніца ўзнікла ад слова «зярно». Людзі прыходзілі ў Азярніцу — азярніцца, па «зярно» — гэта значыць па багацце і натхненне.

Акоўка

Праз вёску Азярніца працякае рэчка Акоўка. Мясцовая легенда распавядае, што калі на вёску напалі крыжакі, мясцовыя жыхары схаваліся на адзін невялікі астравок. Крыжакі іх заўважылі і вырашылі прайсці праз рэчку, якая тады была вельмі шырокай, каб людзей захапіць у палон. Але вяскоўцы на востраве пачалі маліцца Богу. І раптам сярод лета наступіла зіма: рэчка пакрылася лёдам і скавала ўсіх крыжакоў, якія ўвайшлі ў ваду. Ворагі загінулі, а людзі вярнуліся дамоў.

Акунінава

На ўзгорку вялікага лесу, які называецца Шумны бор, жыў некалі ляснік Акунін. Яго сядзіба знаходзілася на лясной паляне, вакол якой былі адны балоты. Гэта месца людзі называлі Акунін востраў. Акунін жыў у канцы XIV — пачатку XV стагоддзя. У 1432 годзе Шумны бор перайшоў у прыватную ўласнасць, і Акуніна папрасілі адтуль выселіцца. Але ён хутка памёр, а сядзіба запусцела. Праўда, з цягам часу туды пачалі сяліцца людзі, бо гэта было вельмі зручнае для

жыцця месца. І ўжо ў другой палове XV стагоддзя на востраве з'явілася вёска Акунін. Але праз некалькі стагоддзяў вёску ўжо пачалі называць Акунінава.

Існуе і яшчэ адна легенда пра Акунінава. Вяскоўцы расказваюць, што на месцы вёскі некалі было вялікае балота, дзе вадзілася шмат акунёў. Калі возера высахла, на тое месца пачалі сяліцца людзі. Яны так і назвалі вёску: Акунёва, Акунінава.

Баравікі

Бор — гэта сасновы лес. Сосны звычайна растуць на ўзвышшы, дзе менш вільгаці. Такія месцы заўсёды зручныя для пасялення людзей. Вось такое месца і выбралі першыя жыхары вёскі Баравікі — месца, якое знаходзілася побач з борам. Ад слова «бор» і назвалі сваю вёску Баравікі. Дый, відаць, у бары расло і шмат баравікоў.

Бракава

Пра вёску Бракава старыя людзі расказалі, што на месцы цяперашняга Бракава быў лес, у якім раслі толькі вялікія сосны. У гэты лес прыязджалі палякі, якія высякалі зграбныя сосны і іх прадавалі.

Аднойчы ў гэты лес яны прыслалі свайго прадстаўніка — бранёра, які пасяліўся там каля соснаў. Потым з цягам часу гэта пасяленне лесарубаў назвалі Бракава.

Бярдовічы

На месцы, дзе цяпер знаходзіцца вёска Бярдовічы, быў некалі хутар. На тым хутары жыў адзін чалавек. Гэтага чалавека людзі называлі майстрам. Але майстар нічога асаблівага рабіць не ўмеў, бо ў яго здольнасць была адна — бёрды. Такіх майстроў не мелі ніводная бліжэйшая вёска і ніводзін хутар. Бо не так проста было зрабіць бёрды для кроснаў. А ён умеў — рабіў бёрды хутка, добра і якасна. Усе вяскоўцы прасілі майстра, каб ён паказаў

і навучыў рабіць бёрды, але майстар адмаўляўся.

Аднойчы ён пагадзіўся быць настаўнікам па вырабу бёрдаў. Ён склікаў людзей і паказаў, як трэба іх вырабляць. Гэтаму рамяству ён вучыў вяскоўцаў з радасцю. І людзі яго вельмі палюбілі, нават не хацелі вяртацца ў свае вёскі і хутары. Яны побач з ім будавалі хаты і гумны. Так хутка з'явілася вёска, якую шчыра назвалі Бярдовічы.

Возера Бяздоннае, камень-бацька і камень-сын

Возера Бяздоннае знаходзіцца на поўдні вёскі Клепачы Слонімскага раёна. Жыхары гэтай вёскі пра возера расказваюць такую легенду. Даўнымдаўно на месцы сучаснага возера была вёска з дзвюма вуліцамі, якія перасякаліся. Аднойчы ў гэту вёску прыйшла бедная жанчына. Яна хадзіла па хатах і прасіла міласціны. Але людзі яе не вельмі ветліва сустракалі — зняважалі, некаторыя

адмаўляліся даць кавалачак хлеба ці бульбінку, сякое-такое адзенне. Жанчына добра разумела, што жыхары гэтай вёскі і самі жылі не вельмі багата. Тым не менш ёй было да болю крыўдна, што яе так зневажалі. Жанчына ішла і моцна плакала. Але раптам з крайняй хаты выйшаў мужчына і паклікаў незнаёмку ў хату, накарміў яе і даў яшчэ хлеба на дарогу. Здзіўленая жанчына была вельмі ўдзячна за такую дабрыню, шчырасць і міласэрнасць. Яна запытала гаспадара: «Хто яшчэ жыве з вамі ў гэтай добрай хаце?» Мужчына адказаў, што жонка яго памерла ўжо даўно,

а ён жыве з сынам-падлеткам. Тады жанчына папярэдзіла: «Бярыце свайго сына і як мага хутчэй уцякайце з гэтай вёскі, бо ваша вёска хутка праваліцца ў бездань і загінуць усе людзі разам з усёй маёмасцю. Ідзіце з сынам на гару, якая бачна з вёскі на поўнач гледзячы, але не аглядайцеся на сваю хату».

Мужчына з сынам паслухалі жанчыну і хуценька выйшлі з вёскі на гару, але не вытрымалі і азірнуліся. Вёскі ўжо не было. Замест яе ўтварылася возера, а дзе былі дарогі — там засталася гладзь вады. А бацька з сынам ператварыліся ў два камені-валуны: меншы — ка-

мень-сын, большы — камень-бацька. І цяпер гэтыя валуны ляжаць на ўскрайку вёскі Клепачы Слонімскага раёна. Людзі іх і сёння называюць бацькам і сынам. А возеру далі імя Бяздоннае, бо вёска праваліся ў бездань. І да сённяшніх дзён ніхто ў ім не можа вымераць глыбіню і дастаць да дна.

У 1976 годзе слонімскі паэт Алесь Сучок (1916–1993) напісаў «Баладу пра Бяздоннае возера». Яна гучыць так:

Між гор яно. Упадзінай глыбокай,
Як люстра светлае,
блішчыць з далечыні.
Улетку ў ім там мыюцца аблокі,
І мноства хваль — пайдзі пералічы.

Легенды ходзяць сумныя ў народзе:
На месцы тым, дзе возера разліў,
Было мястэчка люднае такое, —
І ўсё пайшло наскрозь зямлі,
ў прарыў.
Ў людской легендзе, можа, праўды
сіла,
Стары тут могільнік пры беразе
зусім.
І пліты на магілах ў моху сівым,
Ніхто не помніць стаўленыя кім.
У час вячэрні, як няма аблокаў,
Як сонца твар схіляе да зямлі,
Паглянь на возера.
У тоні вод глыбокіх
Убачыш вуліцы ў мястэчку, як ішлі.
Уявіш мітуслівы клопат ранні,
Пачуеш песню, з поля ідучы.
І спраўдзіцца легенды той казанне, —
Усё, што людзі змогуць зберагчы.

Возера Бяздонка

Паміж вёскамі Ісаевічы і Дзераўной ёсць прыгожае лясное возера Бяздонка. Ні адзін ручай не ўпадае ў гэтае возера і не выцякае з яго. Зімой возера не замярзае. Ляжыць яно паміж невысокіх гор. Пра гэта возера людзі расказваюць такую легенду.

Даўным-даўно жыў у Ісаевічах пан. Было ў яго многа нявольніц — прыгожых дзяўчат з усяго свету. Жылося ім вельмі цяжка. Пан і яго падпанкі здзекаваліся з дзяўчат. Аднаго разу пан узлаваўся на прыгажунь,

схапіў трохгадовага хлопчыка і кінуў у возера. А сам нікога не дапусціў да вады, пакуль хлопчык не патануў. Маладая маці доўга шукала сына, каб пахаваць. Але возера было такое глыбокае, што дна ніхто не мог дастаць. Возера страшна бушавала, вада была чорная, як сажа. Не вытрымала маці свайго вялікага гора і ўтапілася. Вада ў возеры з тае пары стала чыстая-чыстая і падобная на матчыны слёзы.

Вомшара

У лясным масіве недалёка ад вёскі Хадзявічы Слонімскага раёна і вёскі Сынковічы Зэльвенскага раёна ёсць урочышча, якое людзі называюць Вомшара. Вяскоўцы расказваюць розныя легенды пра Вомшара. Напрыклад, калі хто ішоў у лес па грыбы, ці гнаў у лес пасвіць каровы, ці ехаў па дровы, яго папярэджвалі: «Каб не заходзіў і не ехаў у Вомшара». Бо той, хто туды трапляў, дамоў ужо не вяртаўся. У Вомшары жыў лесавік Вомшар, які летам, восенню і вясною хапаў людзей і цягнуў

у сваё тарфяное балота. Зімою лесавік спаў, таму тады можна было на санях смела праехаць праз Вомшара. Людзі баяліся і баяцца сёння Вомшара, стараюцца яго абыходзіць бокам.

Высацк

Калі яшчэ не было гэтай вёскі, людзі жылі ў нізіне ў балотнай мясцовасці. Ім там жылося вельмі дрэнна, бо зямля была неўрадлівая і вадзілася шмат камароў. Аднойчы вырашылі яны памяняць сваё месца жыхарства на іншае. Сабралася ўся вёска на сход. На ім вяскоўцы прыдумалі знайсці такое месца, дзе будзе бліжэй да сонца. Доўга яны хадзілі-блукалі ў пошуках месца для жыцця, і неяк усё ж натрапілі на даволі высокую мясцовасць. Перабраліся туды і назвалі сваю вёску Высацк.

Вядзьмар Шашэйка

Старыя жыхары вёскі Хадзявічы часта расказваюць легенды пра старога ведзьмара Шашэйку, які не любіў, калі бралі шлюб маладыя вяскоўцы. У дзень вяселля ён прыходзіў да хаты маладажонаў, глядзеў на іх і нешта варажыў. Неяк адна пара прыехала з царквы. Перад тым, як зайсці ў хату, маладых саджалі на ўслончык і падкідалі ўверх. Шашэйка нешта пашаптаў, і ўслончык, на якім сядзелі маладыя, пераламаўся папалам. Хлопец з дзяўчынай у хуткім часе разышліся.

На другім вяселлі ў хату, дзе гулялі госці, забеглі два шалёныя сабакі і пачалі кусацца. Насіліся па хаце да таго часу, пакуль іх не аблілі вадой, і тады яны, спалохаўшыся, выбеглі на вуліцу. Праз некалькі гадоў і гэта пара развялася, бо Шашэйка і ім наваражыў бяды.

Доўга так вядзьмар Шашэйка рабіў непрыемнасці. Але аднойчы з царквы прыехала новая пара. Вяскоўцы прыйшлі паглядзець на маладых. Быў там і Шашэйка. Ён стаяў каля плота і нешта мармытаў. Убачыла гэта бабуля нявесты і кажа: «Дзеткі, вы не бойцеся, а ідзіце за мной і рабіце тое, што

буду рабіць я». Бабуля ўвайшла ў хату не праз дзверы, а праз акно. А за ёй праз акно ў хату пралезлі маладая з маладым. Шашэйка, як убачыў такое, спалохаўся і сам сабе прамовіў: «Гм, яшчэ мацнейшая за мяне вядзьмарка». Пасля гэтага выпадку вядзьмар Шашэйка не хадзіў на вяселлі і неўзабаве памёр.

Гарадок

Адно з гарадзішчаў каля вёскі Ніз Слонімскага раёна людзі называюць Гарадок. Паводле легенды, якую расказваюць жыхары вёскі Ніз, калісьці тут быў горад, у якім жылі вельмі моцныя і дужыя людзі. Яны вырывалі сасновыя дрэвы з каранямі і хадзілі, абапіраючыся на іх, як на кійкі. У паўднёва-ўсходнім раёне Гарадка збіраліся бесы і спявалі «бандуркі». Іх страшэннае выццё наводзіла страх на ўвесь Гарадок. Непадалёк ад Гарадка на «страпчым перавозе»

адбываліся забойствы і рабаўніцтвы. А побач стаяў тракцір, дзе ў якасці ежы прадавалі чалавечае мяса. Адзін святар пракляў гэтую мясцовасць. Пасля пракляцця каля Гарадка ўтварылася вялікая адтуліна, якая вяла ў бездань. З бездані ўсе чулі рыканне жывёл і д'ябальскія енкі. Пасля ўсяго гэтага моцныя і дужыя людзі з Гарадка спалохаліся, разбегліся хто куды і пасяліліся ў іншых месцах. А тую мясціну цяпер называюць Гарадок.

Гарадзішча каля Збочна

Паводле мясцовай легенды, гарадзішча каля вёскі Збочна Слонімскага раёна звязана з закапаным скарбам, які ноччу свеціцца. А была справа так. Нейкі салдат, які ў гэтай мясцовасці прымаў удзел у бітве, аднойчы закапаў ваенны залаты скарб. Прайшло шмат гадоў. Калі ён стаў старым, то ўспомніў пра закапанае багацце і прыехаў сюды, каб яго адшукаць. Калі ён падышоў да гарадзішча, то ўбачыў, што ўжо не растуць альховыя дрэвы, пад

якімі быў закапаны скарб. Стары салдат пачаў шукаць скарб, але дарэмна. І тады ён сказаў мясцовым людзям пра золата, і калі хто яго знойдзе, то хопіць ім і іх нашчадкам. Людзі кажуць яшчэ, што чатыры разы ў суткі — вечарам, ноччу, раніцай і ў поўдзень — многія бачылі, як прасушвалі скарб.

Гіганцкая рыба

Пра Бяздоннае возера існуе вельмі шмат легендаў. Мясцовыя людзі распавядаюць, што ніхто ніколі не змог у ім дастаць дна. А справа ў тым, што дно возера як жывое: яно то з'яўляецца, то ўцякае з-пад ног. Аднойчы аквалангісты вырашылі даследаваць дно вадаёма. Яны спусціліся ў ваду, але праз пяць хвілін выскачылі з вады і са страхам пачалі распавядаць, што на дне Бяздоннага возера яны ўбачылі гіганцкую рыбу, якая плыла проста на іх. Магчыма,

гэта гіганцкая рыбіна ахоўвае дно Бяздоннага возера.

Грынкі

Адна з легенд распавядае, што на месцы вёскі Грынкі некалі жыў жабрак. Людзі баяліся блізка падыходзіць да яго. З суседніх вёсак і хутароў гэтага чалавека называлі «грынлівы жабрак». Ён быў дзіўны, а таксама на ім было шмат лішаёў. Усе баяліся з ім сустрэцца, бо казалі, калі грынлівы жабрак дакранецца, то цела пакрыецца лішаямі. Але там, дзе жыў грынлівы жабрак, была вельмі ўрадлівая зямля. І калі жабрак памёр, то людзі хутка перасяліліся туды. А месца назвалі Грынкі ад слова «грынлівы».

Грыўда

Вёска Міжэвічы знаходзіцца на беразе ракі Грыўда. Легенда расказвае, што некалі злыя людзі праклялі дваіх закаханых маладых людзей.

Аднойчы, калі маладыя ехалі на конях, яны нечакана адчулі, што з коньмі нешта адбываецца. І раптам коней не стала — яныператварыліся ў два камені, з-пад якіх пэўны час выцякаў маленькі ручаёк, як сімвал вялікага кахання. Вада струменіла, цякла па камянях, уздыхала. І ў гэтым сумным дыханні было чуваць: «Крыўдна,

крыўдна, крыўдна…» Але не ўсе разумелі першыя літары слоў, нават не ўсе іх дачувалі, таму рэчку назвалі Грыўда.

Дзве легенды пра Дзявяткавічы

У бацькі было дзевяць сыноў. Ішоў час, сыны сталі дарослымі. Першым ажаніўся старэйшы сын. Нарадзіліся дзеці. Стала цесна ў невялікай хаце. Вось і кажа бацька старэйшаму сыну: «Выбірай, сынок, зручнае месца. Будзем табе новую хату будаваць». Сын выбраў зручнае месца для пасялення, а бацька з братамі дапамаглі яму пабудаваць хату. Потым ажаніліся іншыя браты. Адзін за адным, услед за старэйшым братам, будавалі яны сабе хаты. Хутка

ўзнікла вёска з дзевяці двароў. Вось і вырашылі браты назваць сваю вёску Дзявяткавічы.

* * *

Гандляры, калі ехалі са Слоніма ў Косава, спыняліся і прадавалі мясцовым жыхарам свае тавары. Хутка па гэтай дарозе, па Косаўскім тракце, як кажуць у народзе, пачалі сяліцца людзі. Хутка іх паселішчы пераўтварыліся ў вёскі. На дзевятнаццатым кіламетры, а гэта была сярэдзіна шляху, узнікла яшчэ адна вёска. Яна аказалася дзявятай па ліку. Вось і вырашылі вяскоўцы назваць яе Дзявяткавічы.

Дундар

Аднойчы юная пастушка з вёскі Ганькі пагнала пасвіць у поле карову. Бліжэй да абеду цёмныя хмары завалаклі неба. Пачалася навальніца. Дзяўчынка ўбачыла ў полі вялікі камень, схавалася за ім ад ліўня. Але раптам гром стукнуў у камень і забіў дзяўчынку. Пайшла па вёсцы пагалоска, што дзяўчынку ў полі забіў дундар. І цяпер калі ў вёсцы хто сварыцца, дык жадаюць: «Каб цябе дундар свіснуў!»

Жыровічы

Існуе паданне, што на месцы сённяшніх Жыровічаў была вялікая пушча. Гэтай пушчай валодаў нейкі паганец па прозвішчу Жыр. Ён лавіў на лясных сцежках і дарогах людзей і браў іх у палон. У палоне яны будавалі хаты і жылі пад наглядам паганца. Шмат ім было злоўлена люду. Але Жыр хутка памёр. І людзі сталі вольнымі, а мястэчка назвалі Жыровічы.

Жыровіцкая ікона Божай Маці

Калісьці даўным-даўно на месцы манастыра быў дрымучы лес. Як і ўсё наваколле вёскі Жыровічы, належаў ён падскарбію Вялікага Княства Літоўскага Аляксандру Солтану. Аднойчы летнім днём 1470 года мясцовыя праваслаўныя вернікі пасвілі ў лесе кароў. Непрыкметна зайшлі яны туды, дзе ніколі раней не былі. І ў лясным паўзмроку заўважылі ў галінах лясной грушы-дзічкі нязвыклае дзіўнае святло. Яны спусціліся з пагорка на бераг

ручая і здзівіліся яшчэ больш. На дрэве, у зялёналістым атачэнні, як у шатах, цудадзейным святлом праменіўся абразок Божай Маці з яе Святым Сынам на правай руцэ. Пастухі знялі абразок з дрэва. Быў ён выразаны з каштоўнага каменю яшмы, невялікі, змяшчаўся на далоні. Меў авальную форму.

Усцешаныя незвычайнай знаходкай, пастухі аднеслі абразок Солтану. Той не надаў значэння расказам пастухоў і схаваў яго ў куфэрак. Калі ж на наступны дзень захацеў паказаць лясную знаходку гасцям, абразка ў куфэрку не аказалася. Не адчуваючы нічога благога

да служылых людзей, гаспадар маёнтка, аднак, моцна здзівіўся гэткаму здарэнню.

А праз некалькі дзён пастухі знайшлі зніклы абразок у тым самым лесе, над тым самым ручаём і на той жа дзікай грушы. Яны зноў знялі яго і зноў перадалі свайму гаспадару. Аляксандр Солтан, усвядоміўшы незвычайнасць падзеі, сам пайшоў на месца з'яўлення абразка. Там ён даў абяцанне збудаваць у гонар дзівоснай праявы царкву. Неўзабаве тут паўстаў драўляны храм, галоўны алтар якога знаходзіўся акурат на месцы, дзе расла лясная груша. А пазней узнікла там паселішча Жыровічы.

Забалацце, Смаўжы, Засімавічы

Вёскі Смаўжы, Засімавічы, Забалацце заўсёды былі баярскія. Назвы тлумачацца вельмі проста. Забалацце было за балотам, таму так і назвалі вёску. Смаўжы знаходзіліся каля самай багны, там вельмі шмат было смаўжоў. А першымі жыхарамі Засімавічаў былі два чалавекі, абодвух клікалі Засімамі. Так, паводле легендаў, і ўзніклі назвы «Забалацце», «Смаўжы» і «Засімавічы».

Іярданка

Пра рэчку Іярданку існуе такая легенда. Некалі на рацэ недалёка ад вёскі Вялікая Кракотка стаяў млын. Ён належаў мясцовым яўрэям, якія жылі побач. У сям'і гэтых яўрэяў былі дачка Данка і сын Іяр. Аднойчы яны селі ў лодку і паплылі па рацэ па цячэнні. Калі яны плылі, пачалася навальніца з маланкай, громам і градам. Маці гэтых дзяцей выбегла на вуліцу і пачала крычаць: «Іяр! Данка!» Але дзеці так і не пачулі маці і ніколі не вярнуліся дамоў. Яны загінулі. Хутка яў-

рэі прадалі млын і ўсю сваю гаспадарку і некуды назаўсёды выехалі. З таго часу людзі пачалі называць рэчку Іярданкай. Хаця, магчыма, з часоў першых праваслаўных хрысціян рэчку гэту пачалі называць у гонар палесцінскай ракі Іярдан.

Казлы – Альбярцін

Слонімскі мікрараён Альбярцін у народзе называюць Казламі. І на эмблеме кардонна-папяровага завода «Альбярцін» адлюстраваны козлік. Існуе легенда, што калі ў Альбярціне пасяліліся паны Пуслоўскія, яны пачалі займацца паляваннем. Найперш адстрэльвалі ў мясцовых лясах ласёў і казуль. Іх мяса салілі ў бочках, а потым прадавалі за мяжу. І дзякуючы гэтаму сталі багатымі людзьмі. А ў дваццатых гадах мінулага стагоддзя, калі пачаў працаваць завод,

іншай эмблемы, як малюнак казла (казулі), прыдумаць не маглі. І людзей, якія жывуць у Альбярціне, называюць сёння казламі.

Канатоп і Вялікі Млын

Недалёка ад вёскі Старая Паравалока ёсць штучнае возера Вялікі Млын, створанае на рацэ Зяльвянка. На гэтай рэчцы былі пастаўлены шлюзы, праз якія вада падавалася на вадзяны млын. Існуе легенда, што той млын пабудавала пані Лідкоўская, якая прыехала сюды са сваім сынам яшчэ да вайны. Вялікі млын рабіў некалькі аперацый. Таму і возера называлі Вялікі Млын. А за возерам было месца Канатоп. Людзі расказваюць, што аднойчы туды

паехала запрэжаная павозка. Назад яна вярнуцца не змагла, бо патанула ў багне разам з канём і людзьмі. З таго часу людзі так і кажуць: Канатоп.

Курачы і падухоўныя

Паводле легендаў, прозвішчы жыхарам цэлых вёсак даваліся па розных прычынах. Напрыклад, жыхароў былой вёскі Цывіншчына называлі курачамі. Называлі іх так за тое, што яны звычайна раніцай не спяшаліся на кірмаш, бо любілі даўжэй паспаць. Калі жыхары вёсак Нагуевічы і Харашэвічы ўжо ехалі на рынак, цывінцы толькі прачыналіся, закурвалі свае цыдулькі, запальвалі печы. Карацей, раніцай уся вёска «курыла».

А вось жыхароў вёскі Першыя Пятралевічы называлі плябанцамі. Яшчэ пры Польшчы да 1939 года назва гэтай вёскі гучала так — Пятралевічы Падухоўныя. Бо жыхары гэтай вёскі былі замацаваны за царквой і працавалі на духавенства. Таму, калі ў вяскоўцаў пыталіся, дзе яны жывуць, тыя адказвалі: «У плябані».

Клепачы

Назва вёскі Клепачы паходзіць ад таго, што жыхары гэтай мясцовасці вельмі рана пачыналі кляпаць косы ў час касавіцы. Стук малатка аб касу будзіў жыхароў з усіх навакольных вёсак. Вось іх і пачалі называць клепачамі і вёсцы далі такую ж назву.

Крынічка каля Збочна

Адна слонімская жанчына нарадзіла сляпое дзіця і вельмі гаравала, таму што ніхто не мог дзяўчынцы вярнуць зрок: ні дактары, ні шаптуны. Аднойчы жанчына даведалася, што ў вёсцы Збочна ёсць святая каплічка, а таксама крынічка са святой вадой. Вырашыла яна наведаць каплічку. Узяла дачушку на рукі і пайшла, хаця не ведала, дзе насамрэч струменіць крынічка. Доўга яна хадзіла па наваколлі каля Збочна, прытамілася, села адпачыць.

Раптам бачыць невялічкую крынічку, падышла і стала піць ваду. І дзяўчынка спатоліла смагу, памыла тварык халоднай і чыстай вадой. А праз некалькі хвілін малая закрычала: «Мама, паглядзі, вунь тая каплічка, якую мы шукалі!»...

Лапухова

Пра вёску Лапухова легенду ведаюць усе вяскоўцы. Жыў некалі на вялікай гары змей. І былі ў яго вялікія чорныя крылы, доўгі хвост і лапы. Кожны дзень змей аблятаў свае ўладанні. Аднойчы ён пралятаў над Пенным балотам — урочышчам каля Лапухова. Зверху змей убачыў пасярод балота высокі сухі ўзгорак, які быў абнесены сцяной і валам. Зацікавіла гэта змея, ён падляцеў бліжэй і ўбачыў людзей. З вышыні змей прапанаваў людзям, каб яны яму падпарадкаваліся.

Але людзі адмовіліся і пачалі з ім біцца. Змей быў мацнейшы за людзей, ён спаліў узгорак і мужчын. Жывымі засталіся толькі жанчыны. Змей ператварыўся ў прыгожага юнака і спусціўся на зямлю. Каб застацца жывымі, змей прапанаваў жанчынам падпарадкавацца. Але раптам насустрач змею выехала на алені Вялікая Маці з лісцем лопуху ў руках. За ёй ішла Вялікая Сястра з факелам. За Сястрой — Цётка з гляком крынічнай вады і Вялікая Дачка з лукам і стрэламі. І сказалі яны змею: «Будзь нашым уладаром і мужам». Узрадаваўся змей і ад шчасця наладзіў вялі-

кі баль. Некалькі дзён усе пілі і гулялі, а змей напіўся і расказаў, што ён мае чатыры чароўныя зубы. Адным зубам ён кіруе агнём, які паліць лясы, зямлю, паветра. Другім — гарамі, палямі, стэпамі, астравамі. Трэцім зубам — паветрам і птушкамі, чацвёртым — дажджамі і снегам, акіянамі і рэкамі, азёрамі і балотамі, а таксама рыбамі. І зразумелі жанчыны, што ўся сіла змея ў зубах. І калі ён заснуў, кабеты каменем выбілі зубы змею. Раззлаваўся змей, але нічога зрабіць не змог. Ён паляцеў на сваю гару і схаваўся назаўсёды ў пячоры. А дочкі Вялікай Маці нарадзілі сабе сыноў

ад змея, якія засяліліся побач. Мястэчка каля Пеннага балота назвалі Лапухова. Бо менавіта Вялікая Маці з лопухам у руках перамагла змея.

Старыя вяскоўцы Лапухова распавядаюць, што ва ўрочышчы Пеннае балота яшчэ пасля вайны можна было ўбачыць сухую гару Груд, на вышыні якой ляжалі вялікія камяні, выкладзеныя сцяною. Менавіта там, паводле легенды, знаходзілася гарадзішча, якое спаліў змей.

Легенда пра вяселлі на Сехнавым полі

У народзе кажуць: вяселле нікому дарогі не саступае. Каля Радавіцкага лесу на Сехнавым полі каля вёскі Бярдовічы аднойчы сустрэліся два вяселлі. Адно вяселле ехала з вянчання з Сынковіцкай царквы, а другое ў царкву ехала вянчацца. І вось яны сустрэліся ў адной калейцы ад колаў. Ніхто не хацеў саступаць дарогі. А вяселлі тады былі невялікія: маладыя, сват, сваццч, сябры і сяброўкі. Пачалася бойка. Біліся ўсе да таго моманту, пакуль адзін

аднаго не пазабівалі. Там іх і пахавалі ўсіх. Пра гэта каля Бярдовічаў нагадваюць каменныя курганы.

Малая і Вялікая Кракоткі

Так называюцца на Слонімшчыне дзве вёскі. Як расказваюць мясцовыя жыхары, даўным-даўно на поўначы слонімскага краю згарэла ад маланкі і грому ўся вёска. А ў гэтай вёсцы жылі браты Кракі. Пасля пажару яны селі ў два чаўны і паплылі па роднай рацэ Іярданцы ў пошуках новага месца для пасялення. Іярданка ў той час была вельмі глыбокая і шырокая. Плылі браты, плылі, пакуль не спыніліся там, дзе сёння стаіць вёска Вя-

лікая Кракотка. Месца Кракам спадабалася. Старэйшы брат прапанаваў малодшаму застацца тут і пачаць будаваць сабе жыллё. Але малодшы Крак падумаў-падумаў і сказаў: «Я крыху адплыву далей, можа, там яшчэ лепшае месца будзе». І ён паплыў. Адплыў зусім недалёка і заснаваў там вёску Малая Кракотка. А старэйшы яго брат — Вялікую Кракотку.

Масілавічы

На тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца вёска Масілавічы, быў некалі хутар, на якім жылі чатыры сям'і: Масалыкі, Масаляны, Масевічы і Масілавічы. Жылі яны дружна, не спрачаліся. Неяк Масалыкі, Масаляны, Масевічы і Масілавічы сабраліся разам і пачалі думаць, як назваць свой хутар. Масаляны прапанавалі назваць у гонар іх прозвішча. Але Масевічы такой прапановай засталіся незадаволены. Тады Масалыкі і Масілавічы параілі цягнуць жэрабя. Накідалі ў шапку чатыры

трэсачкі: тры роўненькія і адну карацейшую. І той, хто выцягне карацейшую, тым прозвішчам і вырашылі назваць свой хутар Масалыкі, Масаляны, Масевічы і Масілавічы. Карацейшая трэсачка трапіла Масілавічам. Таму так і назвалі свой хутар, а потым стала так называцца і ўся вёска — Масілавічы.

Махначы

Вясковыя людзі пра Махначы распавядаюць страшную легенду. Нібыта на месцы, дзе зараз знаходзіцца вёска, рос густы лес. І ў гэтым лесе жыў адзін чалавек. Быў ён вельмі калматым. Але людзі так яго не называлі, а казалі па-мясцоваму — махнаты. Усе вельмі баяліся махнатага чалавека. Але ў лес па ягады і грыбы ўсё роўна хадзілі. А калі хто ў лесе заблудзіўся і дамоў не вяртаўся, казалі, што схапіў яго махнаты чалавек. За шмат гадоў нахапаў махнаты шмат люду. Дамоў ён

нікога не пускаў, таму людзі жылі ў лесе, дзе будавалі сабе жыллё. І нават прозвішча мелі Махнач, Махновіч. А калі махнаты чалавек памёр і людзі сталі вольнымі, сваё паселішча яны назвалі Махначы.

Мізгіры

Існуе легенда, што там, дзе цяпер знаходзіцца вёска Мізгіры, жыў павук. Месца было вельмі добрае, зямля ўрадлівая. Але павук, якога людзі называлі Мізгір, нікога на сваю зямлю не пускаў. Ён ахоўваў яе днём і ноччу. Вакол зямлі павука Мізгіра раслі высокія сосны. Павук вакол соснаў наплёў шмат павуціны, і людзі ніяк не маглі праз яе пралезці. А калі яны пачыналі сякерамі сячы і нажамі рэзаць павуціннe, прыбягаў Мізгір. І ўсе ўцякалі. Аднойчы сабраліся людзі ўсе

разам і вырашылі забраць у Мізгіра добрую зямлю. Прыйшлі яны да павуціння і пачалі сячы яго і рэзаць. Калі ачысцілі дарогу да добрай зямлі, Мізгіра нідзе людзі не ўбачылі і не знайшлі. Не з'явіўся ён ні праз год, ні праз два. Падзялілі зямлю людзі між сабой, пабудавалі хаты і сталі жыць. А вёску назвалі па імені павука Мізгіра.

Мілаванне

Некалі праз вёску праходзіў стары сівы падарожнік. Ён вельмі моцна хацеў піць. І раптам на яго шляху ўзнікла крыніца. Падарожнік напіўся вады з гэтае крыніцы, наталіў смагу. На смак вада яму вельмі спадабалася, і ён у захапленні прамовіў: «Мілая вада!» З таго часу і сталі называць пасяленне, якое ўзнікла на гэтым месцы, такой мілагучнай назвай — Мілаванне.

Падлужжа

Так называецца ўрочышча недалёка ад вёскі Хадзявічы. Паводле легенды, якую расказваюць вяскоўцы, тут быў вялікі белы палац, дзе жыла пані Падлужанская. У яе было 50 гектараў зямлі. Высокая, худая, прыгожая пані была не замужам. Яна ездзіла на белым кані, была ганаровай і асцярожнай. Да сябе блізка пані нікога не падпускала, асабліва была асцярожнай у адносінах да мужыкоў. Аднойчы людзі заўважылі, што кудысьці пані Падлужанская знікла. Тыдзень

яе не было, месяц... Так пані і не вярнулася. Тады людзі з суседніх вёсак сабраліся і пачалі рабаваць яе белы палац. Расцягнулі ўсё дашчэнту. А тое месца, дзе жыла пані Падлужанская, сталі ў народзе называць Падлужжа.

Пан Сурын

Гісторыя пра пана Сурына адбылася вельмі даўно. Людзі толькі пачалі асвойваць новую мясцовасць, будаваць хаты. Уся гэта зямля належала пану Сурыну. У ваенных паходах пан Сурын пераніў нагу, таму моцна кульгаў. Ён заўсёды быў злосным, гаспадаркай не займаўся, а цэлымі днямі гуляў з панамі-суседзямі ў карты і любіў плаваць.

Аднойчы вясной, калі было вялікае разводдзе, каб заехаць да сваіх паноў-сяброў, Сурын загадаў сялянам пабудаваць

мост. Мясцовыя мужыкі прасілі пана адмяніць загад, бо ім на гэта няма часу, трэба было рыхтавацца да пасяўной. Але Сурын не пагадзіўся на прапановы людзей. Больш за ўсё пана прасіў селянін Дзям’ян, але яго за гэта збілі розгамі так, што ён нават не мог стаяць.

У Дзям’яна было шасцёра сыноў і прыгажуня-дачка Марыя. Старэйшыя сыны на руках прынеслі Дзям’яна дамоў, а за імі ішла і плакала дачка Марыя. Пан Сурын глянуў на дзяўчыну, і яна яму спадабалася, хаця пану ўжо было шмат гадоў.

Сяляне выканалі загад пана, яны пабудавалі мост, высыпалі

добрую дарогу. Але на цэлы месяц затрымалася сяўба збожжа, таму многіх чакаў голад. Некалькі мужыкоў у той час памерлі і ад прастуды.

Пасля Вялікадня пан Сурын аб'явіў, што ён жэніцца з Марыяй. А яе бацька Дзям'ян так і не ачуняў, а потым сышоў у магілу. І тады старэйшыя браты Марыі Гаўрыла і Палікарп вырашылі адпомсціць пану Сурыну за бацьку. Цёмнай ноччу, калі пан вяртаўся ў брычцы з гулянкі, браты спынілі яго на мосце і закалолі віламі.

Хутка пачалася вайна. Ворагі спалілі ўсе хаты вяскоўцаў, забілі шмат людзей, загінулі

таксама Гаўрыла і Палікарп. Таму тады ніхто не шукаў тых, хто забіў пана Сурына, хаця ўсе ведалі, што іх забілі сыны Дзям'яна.

Прайшло шмат гадоў. Новая вёска была пабудавана недалёка ад моста. Старэйшыя жыхары часта ўспаміналі і нават снілі пана Сурына. З часам мост людзі сталі называць Сурынаў мост, а потым усю вёску — Сурынкай.

Пераралока

Паводле легенды, якую распавядаюць старыя жыхары вёскі Пераралока, некалі пераралокцы прымалі да сябе ў абшчыны прыгонных сялянуцекачоў, дык тыя там аўтаматычна атрымлівалі волю. З гэтай прычыны, што ўсе туды «пераралэкаліся», вёска і атрымала сваю назву.

Пляшкі

У далёкія часы наша мясцовасць была пакрыта лясамі, а вакол было шмат балот. Добрае месца для пасялення людзей выбраць аказвалася не так і проста. Для гэтага неабходна было выпальваць лес. А рабілася гэта так. Спачатку дрэвы высякалі, затым выкарчоўвалі пні, а калі ўсё высыхала, дрэвы і пні спальвалі. Такое выпаленае месца называлася на стараславянскай мове плешшу (лысінай). Ад гэтага слова і стала называцца вёска Пляшкі.

Пасля 1964 года вёску Пляшкі сталі называць Партызанаўка. Але старыя людзі ўсе роўна называюць сваю вёску Пляшкі. А ў мясцовай бібліятэцы я нават адшукаў пра вёску верш:

Былі мы калісь пляшкоўцы,
Што тут доўга разважаць.
Назва тая і сягоння
Можа многа расказаць.
Хуценька гады мінаюць,
І ўжо ўнукі запрашаюць
Гасцей шчырых да сяла…
Ну, а *пляшка*, як заўсёды, —
Пасярэдзіне стала.

Пузавічы (Паўлава)

Раней вёска Паўлава называлася Пузавічы. Існуе легенда, што некалі адзін вясковец захацеў у лесе набраць золата, якое збіралі і хавалі ў старым дубе чэрці. Паехаў ён у лес, знайшоў чортаў чароўны дуб, грукнуў па ім кулаком і закрычаў: «Слязьмі адкрыйся!» Дуб пусціў чалавека ў сваю схованку з каштоўнасцямі. Набраў ён золата, а выйсці з дуба не можа. Пачаў крычаць. Пачулі ў лесе крык чэрці, сабраліся каля дуба і вырашылі яму адпомсціць.

Прыцягнулі вялікую бочку са смярдзючай вадой і прымусілі яго піць. Спалохаўся вясковец чарцей і пачаў жлукціць брудную ваду. Жывот яго раздуўся, і стаў ён вельмі тоўстым. Чэрці паднялі яго і кінулі на воз. Ляжыць ён на возе, як бочка, і крычыць: «Маё, маё золата!» Людзі пытаюцца адзін у аднаго, што там такое. «Ды нейкі пузач на возе верашчыць», — адказваюць ім. З таго часу сталі мужыка называць Пузач, а дзяцей — Пузавічамі. З цягам часу і ўся вёска стала называцца Пузавічамі. Праўда, напачатку 1960-х гадоў яе перайменавалі ў вёску Паўлава.

П'явіч-возера

Легенда першая

П'явіч-возера знаходзіцца ў лесе побач з вёскай Дзераўная. Яно схавалася ў дрымотным лесе, мае круглую форму з топкімі берагамі. Таму дабрацца да яго цяжка і нават небяспечна, бо ісці трэба па дрыгве. Травяны насціл пад нагамі заўсёды хістаецца і гушкаецца, а вада пастаянна сочыцца з няўстойлівага балотнага покрыва. Тутэйшыя людзі кажуць, што П'явіч-возера не мае дна. Яго-ная цьмяна-сіняя, з бурым адценнем, без якіх-небудзь

раслін вада і сапраўды здаецца бяздоннай.

Існуе паданне пра хлопчыка-пастушка, які на беразе П'явіч-возера нібыта натрапіў на незвычайную каляровую стужку. Хлопчык пачаў выцягваць яе з вады. Але што гэта? Над гладкім люстэркам возера паказаўся крыж, потым купал царквы. Напалохаўся малы, пабег у вёску. Потым мясцовы святар сказаў людзям, што гэта быў той шчаслівы выпадак, калі бязгрэшны хлопчык, каб не спалохаўся, мог выратаваць, вярнуць з небыцця калісьці патануўшую вёску. А на гэтым вось месцы ўтварылася П'явіч-возера.

Легенда другая

Там, дзе цяпер возера, калісьці была вёска. У ёй жыла адна ўдава. Ніхто ў вёсцы яе за чалавека не лічыў. Пагарджалі ўсе, папікалі, смяяліся з яе. Бо нікому, бедная, слова супраць сказаць не асмельвалася. Быў у яе сынок, якога яна заўсёды прасіла і вучыла, што не трэба злом за зло плаціць.

Аднойчы ў вёску прыйшлі два жабракі — стары і малы. Ніхто іх пераначаваць не пусціў, а пусціла толькі ўдава з сынам. Зайшлі яны ў хату, адпачылі з дарогі, гаспадыня дала перакусіць, а потым паклала іх спаць. Але перад сном стары жабрак

кажа: «Пасля трэціх пеўняў я вас пабуджу. Мы хуценька будзем адсюль уцякаць, бо вёска вельмі ацяжараная людскімі грахамі, яна хутка праваліцца пад зямлю, а на яе месцы паўстане возера».

На світанку жабракі і ўдава з сынам пакінулі вёску. Праз пэўны час яна правалілася пад зямлю, а на яе месцы раскінулася вялікае возера, дзе плавалі здаравенныя п'яўкі. Людзі з суседніх вёсак і мястэчак казалі, што гэта плаваюць душы тых злых вяскоўцаў. А возера яны назвалі П'явіч.

Расколаты камень-валун

Расколаты камень ляжыць у лесе паблізу Альбярціна (мікрараён Слоніма, раней быў пасёлак) каля дарогі, калі ехаць на вёску Якімавічы. Ён большы за тры метры ў вышыню, тры з паловай метры ў шырыню і ў даўжыню.

Сярод слонімцаў бытуе легенда, што некалі тут жыў Янка-асілак. Аднойчы ён сустрэў дзяўчыну незвычайнай прыгажосці і моцна закахаўся. Дзяўчына таксама пакахала юнака. Але аб прыгажуні даведаўся

двухгаловы змей і прыляцеў па яе. Насустрач змею выйшаў Янка-асілак і сказаў: «Трымаю бой не на жыццё, а на смерць, але сваю дзяўчыну табе не аддам».

Янка-асілак і змей сышліся ў чыстым полі. Загрымелі мячы, і пачалася бойка. Доўга біліся ворагі, і Янка бачыць, што перамога зусім блізка. Але ён раптам адчуў, што моцна прытупіўся яго меч. «Эх, і паваст-рыць няма чым! — усклікнуў Янка. — Хоць бы камень які пад рукой аказаўся».

І вырасла перад ім скала, як быццам шчытом закрыла. Не змог змей дастаць сваім мячом Янку, злосна секанўў па камені

што было сілы — раскалолася скала і выбіла меч з варожых рук. Тут Янка і дабіў змея. А расколаты валун да сённяшніх дзён ляжыць на слонімскай зямлі.

Пра слонімскі расколаты камень існуе і другая легенда. Неяк вяртаўся пан Пуслоўскі з лецішча ў свой маёнтак, што быў у Альбярціне. У дарозе яго застала навальніца. Фаэтон Пуслоўскага спыніўся каля самага каменя-валуна. У гэты момант моцна стукнула маланка і трапіла проста ў камень, які ад удару раскалоўся на дзве часткі.

Два тыдні ў маёнтку Пуслоўскіх гарэлі свечкі ў знак таго, што камень выратаваў пана. Ён пасля загадаў паставіць на камені крыж. А неяк слугі Пуслоўскага спрабавалі даведацца, на колькі метраў валун знаходзіцца ў зямлі. Яны пракапалі ўглыб на некалькі метраў, але асновы так і не знайшлі. Пан загадаў спыніць гэту работу і засыпаць яму. Што слугі і зрабілі.

Расказваюць людзі і пра трэцюю легенду пра раскалаты камень. Калі на нашу зямлю прыйшлі бальшавікі, яны знішчылі многія гістарычныя помнікі. Гэта адбывалася і на

Слонімшчыне. Нейкі камісар загадаў узарваць валун некалькім салдатам. А ў той час, магчыма, камень мясцовым насельніцтвам успрымаўся як рэлігійная святыня, што і стала прычынай такой нянавісці з боку атэістычнай улады. Заклалі бальшавікі пад камень узрыўчатку, ды самі падчас выбуху загінулі, а ад валуна адкалоўся толькі кавалак.

Сёння людзі кажуць, што некалі ў шчыліну расколатага каменя магла ўлезці толькі рука. А сёння шчыліна стала шырынёй больш як метр. Мабыць, быў на камені і крыж, бо зверху яго ёсць паглыбленне.

Святое возера

Здаўна на Слонімшчыне існуе паданне пра царкву, што правалілася на беразе невялікага азярца пад назвай Святое, якое з цягам часу ператварылася ў сажалку.

А пад гэтым Святым возерам, згодна з паданнем, знаходзілася тая самая царква. Мясцовыя старажылы, калі ўспамінаюць сваё маленства, прыгадваюць царкоўны перазвон, які, па іх словах, быў заўсёды чуваць з глыбіні Святога возера. Гэта паданне жыве і цяпер. А хто хоча пераканац-

ца ў яго сапраўднасці, няхай паспрабуе прыкласці вуха да берага Святога возера — можа, і пачуе звон.

Святы гай

У старажытныя часы нашы продкі пакланяліся сілам прыроды — узгоркам, камяням, азёрам, дрэвам і г. д. Высокія ўзгоркі і дрэвы лічыліся шляхам да неба. У святых гаях людзі прыносілі ахвяры язычніцкім багам. Там жа адбываліся і сходы жыхароў наваколля. Сляды такіх мясцін захаваліся да сённяшніх дзён. Каля вёскі Ніз ёсць таксама лясок, які людзі называюць Святы гай. А каля вёскі Ягнешчыцы, людзі кажуць, у Святым гаі закапаны скарб — куфар з грашыма, які

заўсёды ахоўваюць сабакі. Так ніхто той скарб і не знайшоў у Святым гаі.

Скуратава студня

Зямля каля вёскі Вялікая Кракотка некалі належала аднаму багатаму чалавеку. У яго была маленькая дачушка, якая амаль нічога не бачыла. Аднойчы ў гэтую мясцовасць завітаў жабрак. Хадзіў ён па наваколлі, хадзіў і заўважыў, што з невялікай гары капае вада. Жабрак падышоў да вады, выпіў крыху, а потым прамыў свае хворыя вочы. І… раптам стаў лепш бачыць. Ад шчасця ён закрычаў на ўсю вёску: «Людзі, глядзіце, тут лячэбная вада!» Багаты чалавек пачаў таксама лячыць

дзяўчынку гэтай вадой. І праз пэўны час яго дачка стала бачыць. А звалі ў вёсцы гэтага багацея Скурат. Ён добраўпарадкаваў месца, дзе цякла вада, і пабудаваў там студню. З таго часу людзі і пачалі называць гэта месца Скуратава студня.

Слонім

Існуе легенда, што на месцы, дзе сёння стаіць Слонім, раней былі палі і лясы. Калі людзі пачалі высякаць лясы і абрабляць зямлю, яны сталі знаходзіць шмат касцей. Гэта былі вялізныя косці мамантаў і сланоў. І потым людзі прыдумалі назву свайму паселішчу ад знойдзеных, найперш слановых, касцей. Маўляў, тут некалі вадзілася шмат сланоў, дык і месца няхай будзе называцца Слонім.

Сялявічы

Існуе легенда, што назва вёскі Сялявічы пайшла ад слова «ссяляцца». Дзе цяпер вёска — там некалі былі тры хутары. На гэтых хутарах людзі жылі далёка адзін ад аднаго. Але кожную раніцу яны выходзілі са сваіх хат і пачыналі дудзець кожны ў свой ражок. Гэта азначала, што ў суседзяў на хутарах усё добра.

Але аднойчы на адным з хутароў ражок не загучаў. Калі суседзі прыйшлі на той хутар, то ўбачылі жудасны малюнак: уся сям'я была забіта. Пасля такога выпадку людзям з су-

седніх хутароў стала вельмі страшна жыць паасобку. Таму яны вырашылі ссяліцца ў адно месца. Ад слова «ссяліцца» і пайшла назва вёскі Сялявічы.

Тарасаў груд

Недалёка ад вёскі Вялікая Кракотка ёсць мясціна, якую людзі называюць Тарасаў груд. Існуе легенда, што Тарасаў груд некалі быў абнесены балотам і вадой. Толькі нейкі Тарас ведаў да той мясціны сцежку. Калі ён пасвіў кароў, то гэтай сцежкай пераганяў іх на тую сухую мясціну. Каровы там удосталь елі траву. А пан з-за гэтага вельмі злаваў, але сам ніяк не мог дабрацца на Тарасаў груд, каб пакараць Тараса.

Трыбушкі

Ходзіць такое паданне, што жыхары гэтай вёскі вельмі любілі шмат есці. Харчаванне ў той час было даволі сціплае — хлеб, бульба ды садавіна. Але тыя людзі, якія працавалі на пана і пан іх кarміў, стараліся з'есці як мага больш. З-за стала яны падымаліся з поўнымі трыбухамі. З той пары і замацавалася за імі мянушка трыбухі, а вёску, дзе яны жылі, сталі называць Трыбушкамі. У 1964 годзе гэту вёску на Слонімшчыне перайменавалі ў вёску Мірная.

Храм каля Збочна

Даўным-даўно праз вёску Збочна ехаў на возе невядомы вандроўнік. Ён вёз з Іерусаліма часцінку Крыжа Гасподняга. І калі воз параўняўся з узгоркам, на якім цяпер знаходзіцца мясцовы храм, валы з возам нечакана спыніліся. Вандроўнік пачаў падганяць, крычаць, біць валоў, але яны далей так і не рушылі. Вяскоўцы ўсё гэта бачылі і вырашылі на гэтым месцы пабудаваць храм Уздзвіжання Крыжа Гасподняга.

Чамяры

Існуе дзве народныя легенды наконт паходжання вёскі Чамяры Слонімскага раёна. Паводле адной з іх, яшчэ ў XIV стагоддзі ў даліне ракі Валобрынкі пасяліліся 17 сем'яў з урочышча Падоськавічы. З Падоськавічаў людзі ўцяклі ад эпідэміі чумы, якая там успыхнула. Гэтую хваробу тады і цяпер на Слонімшчыне старыя людзі называлі і называюць чамер. Нават у сварцы сярод вяскоўцаў можна пачуць: «Ах, каб цябе чамер пабраў!»

Паводле іншай легенды, назва вёскі Чамяры паходзіць ад расліны чамярыцы, якой тады шмат расло ў пойме ракі Валобрынкі. І калі пачалася эпідэмія чумы, людзі з Падоськавічаў хаваліся ў чамярыцы. І ядавітая чамярыца іх выратавала ад чумы. Тады на гэтым месцы яны засталіся жыць. І назвалі паселішча Чамяры.

Чапялейка

З дзяцінства памятаецца гэтая невядомая, страшная, загадкавая істота. Пачуў я пра яе ўпершыню ад свайго суседа дзядзькі Колі Пыцеля ў вёсцы Хадзявічы. Калі дзядзька прыходзіў з працы на абед, а мы ў гэты час сваволілі, дурэлі, то ён, уважліва гледзячы ў акно, казаў: «Вунь за аселіцай ідзе чапялейка з касою, ідзе проста да нас». Мы са страху хаваліся пад ложак і ціха сядзелі, пытаючыся ў дзядзькі Колі: «Дзе чапялейка і які ён?» Дзядзька Коля тады спакойна абедаў і

нам казаў: «Чапялейка барадаты, стары, з касою ў руках». — «А чаму ён з касою ў руках, а не з чапялою, ён жа — чапялейка?» — пыталіся мы. «Таму што чапялу згубіў, а вострую касу ён не згубіць», — казаў дзядзька.

Прайшло шмат гадоў. Пра чапялейку я неяк расказаў слонімскаму дзіцячаму празаіку і драматургу Аляксею Якімовіча. Яму спадабаўся гэты герой, і ён яго ўвёў у свае п'есы для дзяцей.

Чатыры дубы

Каля вёскі Адэлькавічы Слонімскага павета ля курганоў раслі чатыры дубы. У канцы XIX стагоддзя засталіся толькі два. Ходзіць легенда, што ўсе гэтыя чатыры дубы былі зачараваныя. І калі хто спрабаваў ссячы адзін з гэтых дубоў ці галінкі дрэў ці нават узяць лісцік, які здуў вецер, то абавязкова здарыцца якое-небудзь няшчасце — здохне конь, карова ці авечка.

Аднойчы арандатар графа Завішы спілаваў два дубы, і ад гэтага ў яго падохла ўся жывё-

ла. А тыя дубы, якія засталіся, акраплялі святой вадой, і ніхто іх ніколі не чапаў.

Чортава балота

Паміж вёскамі Перавалока і Вострава жыў некалі ў балоце чорт. Балота было невялікае, з кіламетр у даўжыню. І таго, хто трапляў у балота, чорт часта вадзіў гадзінамі і не выпускаў. Аднойчы вясковец Ігнат з Пераваловкі паехаў канём праз тое балота. Ехаў-ехаў ён некалькі гадзін, а потым бачыць, што нікуды ад вёскі зусім так і не ад'ехаў. Яго проста не пусціў чорт.

Чортава вока

Балота за вёскай Азярніца людзі называюць Чортавым вокам. Існуе легенда, што некалі ў вёсцы жыў адзін дзяк. Ён вельмі любіў выпіць. А калі выпіваў, то яму заўсёды было мала. Тады ён браў у царкве што-небудзь каштоўнае і ішоў прадаваць у суседнія вёскі. Аднойчы дзяк узяў срэбны крыж і пайшоў у бліжэйшую вёску. Праходзячы праз балота, упаў і заснуў. Прачынаецца, а перад ім стаіць чорт і кажа: «Ну, мужык, прачынайся, пойдзем — там цябе зачакаліся!» Дзяк спало-

хаўся, пачаў хрысціцца, маліцца — не дапамагае, чорт падыходзіць усё бліжэй і бліжэй да яго. Успомніў ён пра срэбны крыж, дастаў яго і з крыжам пайшоў на чорта. Крыж пачаў свяціцца дзіўным агнём, ды так, што чорт акамянеў і знік пад зямлёй. З той пары людзі называюць гэта месца Чортавым вокам. А дзяк больш ніколі не піў гарэлкі, а шчыра служыў у царкве.

Чортаў камень

Раней каля вёскі Лапухова ва ўрочышчы Груд ляжаў Чортаў камень. Гэта было ўзвышанае месца, абнесенае вакол ровам. На вяршыні былі насыпы з вялікімі камянямі. А навокал распасціралася Пеннае балота — так называлі яго вяскоўцы. Мяркуецца, што ўрочышча Груд было паганскім свяцілішчам. А сам Чортаў камень меў значную велічыню. На ім ноччу збіраліся чэрці і таньчылі розныя страшныя танцы. Як доказ таго, на валуне захавалася мноства розных слядкоў:

і дзіцячай нагі, і авечых, і іншых істот. Але падчас савецкай меліярацыі Чортаў камень кудысьці знік, і змяніўся выгляд урочышча Груд.

Чортава месца

Адна з лясных мясцін у лесе за мікрараёнам Альбярцін Слоніма гараджане называюць Чортавым месцам. Леснікі распавядаюць легенду, што Чортава месца існуе даўно. Той, хто на кані туды заедзе, ніколі назад не вяртаўся па той дарозе, па якой туды змог заехаць. Нават тыя людзі, якія добра ведалі гэты лес, усё роўна блукалі. Так людзі і назвалі тое месца Чортавым. Маўляў, чорт дарогі блытаў.

Шпакова гара

Пасля адмены прыгоннага права ў вёсцы Пятралевічы зямлю падзялілі паміж жыхарамі. Надзелы, якія размяшчаліся ля гары, што знаходзіцца недалёка ад вёскі, былі аддадзены сям'і Шпакоў (дарэчы, іх нашчадкі і па сённяшні дзень жывуць у вёсцы). У свой час Шпакі паставілі аберагальны крыж на дарозе, якая вяла да самай гары, пазней названай Шпаковай гарой. З таго часу вяскоўцы так і кажуць: «Працаваў ля Шпаковага крыжа» ці «Быў за Шпаковай гарой».

Шылавіцкі камень

Па павер’ях, шылавіцкі камень дапамагаў ад галаўнога болю. Пасля таго, як адна пані змачыла вадой са слядка вочы свайму сабачку, камень страціў цудадзейную сілу. Калісьці каменю насілі манеты і палотны, але пазней яго разбіў нейкі вар’ят.

Яруцічы і Яруцянка

Аднойчы ў пана Ружанскага быў банкет з нагоды Калядаў. На ім прысутнічаў і мясцовы пан Руціч. Загулялася панства дапазна, і вяртацца дамоў прыйшлося ноччу. Надвор'е было марозным і завірушным. Коні, спалоханыя воўчым выццём, збіліся з дарогі. Раптам праз завыванне завірухі пачуўся трэск лёду, і сані пайшлі пад ваду.

Пошукі пана Руціча былі доўгімі. І толькі вясной удалося знайсці патануўшых пана і рамізніка. Мясцовыя жыхары

назвалі гэта месца на рацэ Ямай Руціча. Прайшло шмат гадоў, і на беразе ракі ўзнікла вёска. Яе таксама назвалі Ямай Руціча. Але з гадамі назва вёскі скарацілася да аднаго слова — Яруцічы. А рэчку, дзе патануў пан, людзі назвалі Яруцянкай.

Змест

Літаратурна-мастацкае выданне

Легенды і паданні
Слонімшчыны
Сабраў і пераказаў Сяргей Чыгрын

Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*
Рэдактар *А. Спрытніч*
Вёрстка *Л. Ваўчок*
Карэктар *А. Спрытніч*

Падпісана да друку 20.05.2013. Фармат 70х100 1/64. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 2,52. Ул.-выд. арк. 1,21.
Наклад 100 ас. Зак. 297.

ПУП «Кнігазбор».
Ліцэнзія № 02330/0003924 ад 08.04.11.
Вул. Я. Лучыны, 38-93, 220112, Мінск.
Тэл./факс (017) 207-62-33,
тэл. (029) 772-19-14, 682-83-86.
E-mail: bkniha@tut.by

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка ў ААТ «Аргбуд».
Ліцэнзія № 02330/0494197 ад 03.04.09.
Вул. Берасцянская, 16, 220034, Мінск.